

І.В.Сазонаў.



А.Р.Маргуноў.

мёртвы. А Сазонава знайшлі непрытомным і адправілі ў бальніцу, дзе ён праляжаў доўга. Яго ногі, рукі і ўсё цела павольна прыходзілі да нормы.

Пасля выздараўлення ён ужо не працаваў трактарыстам, а выконваў пасільную работу. Зараз Сазонаў на пенсіі. І калі ўспамінае аб тым трагічным здарэнні, то заўсёды здзіўляецца, як гэта ён застаўся жывы ад такога страшэннага выбуху.

*У.К.Цішчанка.*

## Цяжка было, але ніхто не скардзіўся

**З успамінаў А.Р.Маргунова, былога старшыні калгаса «XVI партз'езд»**

Вестку аб вызваленні Слаўгарада я пачуў у шпітальнай палаце. Праз некаторы час ужо пешшу дабіраўся да сваёй роднай Ржаўкі. Сустрэўся з сям'ёй, знаёмымі, а затым накіраваўся ў райцэнтр. Іду з пасведчаннем аб дэмабілізацыі і прызначэнні пенсіі ў кішэні і думаю: «Інвалід, без рукі, на што ты варты цяпер?». А ў райкоме партыі мне прапанавалі ўзначаліць калгас «XVI партз'езд». Спачатку разгубіўся, але, падумаўшы, даў згоду.

З чаго прыйшлося пачынаць?

Шэсць коней, два рабочыя быкі — вось і ўсё, як кажуць, жывое цягло. Дзевяць кароў, дзве свінаматкі — гэта прадукцыйны калгасны статак. Ні кармоў, ні памяшканняў, ні грошай. Зараз нават цяжка ўявіць, як мы тады канцы з канцамі зводзілі. Набліжалася першая пасяўная пасля вызвалення. Не было насення бульбы. І людзі, уразаючы і без таго свае мізэрныя запасы, сабралі па пуду—два бульбы. Выдзеліла нам насенне яравых збожжавых дзяржава. Але яно ляжала ў Слаўгарадзе. Вырашылі прынесці яго на сабе. Раніцай у райцэнтр пайшла група калгаснікаў: Захар Марухаў, Уладзімір Маслоўскі, Фама Краўцоў і іншыя. Увечары яны вярнуліся ў Ржаўку, і кожны з іх прынёс па 20—30 кг насення, і так было не адзін раз. Пешшу, за 18 кіламетраў, насілі людзі на сабе насенне. А калгаснікам паўночных вёсак раёна прыходзілася насіць зерне аж з чыгуначнай станцыі Чавусы, што было яшчэ далей, чым нам. Ішла вайна, і кожны тады працаваў за дваіх, за траіх.

Сабралі першы ўраджай. І адразу ж з калгаса ў Слаўгарад накіраваўся абоз са збожжам. 80 т хлеба засыпаў тады наш калгас у засекі дзяржавы. Толькі насенне пакінулі сабе, ды рэшту раздалі хлебаробам на працадні.

Акрамя таго, трэба было ўзводзіць жывёлагадоўчыя памяшканні, будаваць дамы, нарыхтоўваць кармы. Людзі і сеялі, і жалі, касілі і малацілі, нарыхтоўвалі лесаматэрыял, нават на сабе цягалі плуг, садзілі бульбу. Цяжка было, але ніхто не скардзіўся.

А ў наступным годзе калгас яшчэ больш упэўнена набіраў сілы. Тады мы завезлі на дзяржаўны прыёмны пункт 145 т збожжа, займелі ўласнае насенне ўсіх культур, выдалі хлеб і бульбу на працадні калгаснікам.

## Чарнобыльская хмара над Слаўгарадчынай

26 красавіка 1986 г. на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, што размешчана на тэрыторыі Украіны непадалёку ад граніцы з Беларуссю, адбылася адна з буйнейшых аварый у свеце. У выніку двух выбухаў на чацвёртым энергаблоку ЧАЭС у атмасферу трапіла велізарная колькасць радыеактыўных рэчываў. Каля 70% радыенуклідаў, выкінутых на тэрыторыі еўрапейскай часткі СССР, выпала на тэрыторыі Беларусі.

Чарнобыльская хмара дасягнула і

Слаўгарадскага раёна, пакрыўшы радыенуклідамі амаль усю яго тэрыторыю, у тым ліку раённы цэнтр Слаўгарад. Вынікі катастрофы вельмі негатыўна адбіліся на ўсіх сферах жыцця і дзейнасці ў раёне, паставілі шэраг складанейшых медыцынскіх, экалагічных, сацыяльных і іншых праблем. Весткі аб буйной аварыі ў Чарнобылі, адсутнасць дакладнай інфармацыі рэзка абвастрылі становішча ў раёне, выклікаўшы разгубленасць, трывогу, сацыяльную напружанасць сярод насельніцтва. Найперш, у раённым цэнтры і вёсках пачалася работа па абследаванні тэрыторыі, будынкаў. Але яна праводзілася паспешліва, у большасці выпадкаў неспецыялістамі, да таго ж не хапала дазіметрычнай апаратуры, вопыту. Ужо першыя вынікі абследавання паказалі, што ўзровень забруджанасці раёна вельмі высокі, хоць і не аднолькавы: з 112 населеных пунктаў забруджанасць ад 1 да 5 Кі/км$^2$ мелі 10 пунктаў, ад 5 да 15 —78, ад 15 да 40 — 22, 40 Кі/км$^2$ і вышэй — 2 пункты. У наступныя гады працягвалася ўдакладненне радыяцыйнай сітуацыі ў раёне, пры гэтым выкарыстоўваліся спецыялісты, больш дасканалая тэхніка і методыкі[1]. (Ніжэй прыводзіцца пералік населеных пунктаў Слаўгарадскага раёна, што пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.)

| **Назва сельскага Савета** | **Назва населенага пункта** |
|---|---|
| | Зона 1—5 Кі/км$^2$ |
| Лапаціцкі | Азарычы |
| | Жалезінка |
| | Лапацічы |
| | Пацяраеўка |
| | Узгорск |
| | Улукі |
| | Устаннае |
| | Харанеў |
| | Хварасцяны |
| | Чыкаўка |
| | Зона 5—10 Кі/км$^2$ |
| Баханскі | Анеліна |
| | Боркі |
| | Віш |
| | Вялікая Зімніца |
| | Зацішша |
| | Зялёная Рошча |
| | Малая Зімніца |
| | Малыя Боркі |
| | Труд |
| | Ціш |
| Васькавіцкі | Бязуевічы |
| | Васькавічы |
| | Людкоў |
| | Папоўка |
| | Урэчча-1 |
| | Церахоўка |
| | Ясенавец |
| Гіжэнскі | Бярозаўка |
| | Гіжэнка |
| | Дашкаўка |
| | Забалацце |
| | Заглінна |
| | Закрупец |
| | Любаны |
| | Ляцягі |
| | Рудня |
| | Трасліўка |
| | Целяшы |
| | Чырвоны Кастрычнік |
| Гарсавет | Курганаўка |
| | Міхайлоў |
| | Новая Слабада |
| Каменкаўскі | Казакоўка |
| | Новая Каменка |
| | Старая Каменка |
| Кульшыцкі | Прыволле |
| | Ржаўка-1 |
| | Ржаўка-2 |
| Лапаціцкі | Іванішчавічы |
| | Лясная |
| | Машэцкая Слабада |
| | Рабавічы |
| Свенскі | Брак |
| | Вышкоўка |
| | Дальняя |
| | Дубовы Лог |
| | Лебядзёўка |
| | Лінік |
| | Рэкта |
| | Рэкта-Міхайлаўка |
| | Чарнякоўка |
| | Зона 10—15 Кі/км$^2$ |
| | г.Слаўгарад |
| Баханскі | Смалігаў |
| Васькавіцкі | Барсукоўка |
| | Ганчароўка |

[1] У артыкуле выкарыстаны матэрыялы, падрыхтаваныя Слаўгарадскім райвыканкомам, матэрыялы раённай газеты «Ленінскае слова» і іншых перыядычных выданняў.

| Назва сельскага Савета | Назва населенага пункта |
|---|---|
| | Рудня |
| | Урэчча-2 |
| | Чырвоны Усход |
| Гіжэнскі | Аляксандраўка-1 |
| | Аляксандраўка-2 |
| | Усохі |
| Гарсавет | Кабіна Гара |
| | Міхайлоў |
| | Чачораўка |
| Каменкаўскі | Благадаць |
| | Дубна |
| Свенскі | Слаўня |
| | Перагон |
| | Прудок |
| | Свенск |
| Старынкаўскі | Агеева |
| | Крамянка |
| | Станкі |
| | Усход |
| | Зона 15—30 Кі/км² |
| Баханскі | Бахань |
| | Добры Дуб |
| Васькавіцкі | Гайшын |
| | Селішча |
| Гіжэнскі | Ходараў |
| Гарсавет | Завад-Віравая |
| | Сіліна Поле |
| Каменкаўскі | Кліны |
| Кульшыцкі | Дуброўка |
| | Жаролы |
| | Кульшычы |
| | Курганне |

| Назва сельскага Савета | Назва населенага пункта |
|---|---|
| | Пчэльня |
| | Рабінаўка |
| | Серкаўка |
| Лапаціцкі | Кашалёў |
| | Чырвоная Слабада |
| Старынкаўскі | Дабранка |
| | Старынка |
| | Сяргееўка |
| Свенскі | Перагон |
| | Рагі |
| | Зона 30 і больш Кі/км² |
| Кульшыцкі | Запалянне |
| | Кулікоўка-1 |
| | Кулікоўка-2 |

Адсяленне вялікай колькасці вёсак у Слаўгарадскім раёне запатрабавала вырашэння шэрагу складаных задач. Яно праводзілася ў межах Магілёўскай вобласці, дзе ў чыстых раёнах на дзяржаўныя сродкі ўзводзіліся новыя жылыя пасёлкі і дамы. Частка перасяленцаў атрымала новыя кватэры ў Мінску, Бабруйску, Магілёве, Слаўгарадзе. Першымі ў хуткім часе пасля аварыі былі адселены вёскі Кулікоўка і Запалянне, дзе ўзровень радыяцыі перавышаў 30 Кі/км² і вышэй. Пазней пакінулі свае вёскі жыхары Барсукоўкі, Людкова, Селішча.

Масавае адсяленне насельніцтва ў раёне пачалося пасля прыняцця ў кастрычніку 1989 г. 12-й сесіяй Вярхоўнага Саве-



Зямля, якая нясе небяспеку.



Так выглядала вёска Красная Слабада.

та БССР Дзяржаўнай праграмы па ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС на 1990—1995 гг. і на перыяд да 2000 г. Да 1992 г. Беларусь не адчувала асаблівых цяжкасцей у фінансаванні праграмы, бо яно праводзілася цэнтралізавана з саюзнага бюджэту. Становішча рэзка абвастрылася пасля развалу СССР у 1991 г., калі рэспубліка засталася фактычна сам-насам са сваёй чарнобыльскай бядой.

Па стане на 1 кастрычніка 1994 г. з 24 вёсак, прызначаных да адсялення, поўнасцю вывезены жыхары з 12 населеных пунктаў. З зоны абавязковага адсялення эвакуіравана 1567 сем'яў (4675 чалавек), засталося жыць 314 сем'яў (555 чалавек). Акрамя таго, з зоны з правам на адсяленне (5—15 Кі/км$^2$) выехала 799 сем'яў, у тым ліку 386 з дзецьмі.

У 1995 г. у раёне ліквідаваны калгасы імя Суворава, імя Куйбышава, «Рэвалюцыя», «Памяць Фрунзе». Усяго адселена і самастойна выехалі з раёна 2365 сем'яў. З агульнай колькасці адселеных 240 сем'яў (546 чалавек) перамешчана ў межах раёна, з іх на сяло ўсяго 105 сем'яў. Пры вызначэнні новых месцаў жыхарства ўлічваліся пажаданні перасяленцаў.

Праблему перасялення насельніцтва на новыя месцы ўскладняла нізкая ў шэрагу выпадкаў якасць будаўніча-мантажных работ ва ўзведзеных пасёлках. Нярэдка адсутнічалі камунальна-бытавыя службы, прадпрыемствы гандлёвага і культурнага абслугоўвання. Усё гэта выклікала шмат абгрунтаваных скаргаў з боку перасяленцаў, а многія наогул адмаўляліся пераязджаць у новыя дамы і кватэры. Адаптацыя і замацаванне людзей на новых месцах у значнай ступені залежалі ад вырашэння праблемы



Супрацоўнікі слаўгарадскай аптэкі.

працаўладкавання. Станоўчую ролю адыгрывала і адсяленне з забруджаных месцаў кампактнымі групамі аднавяскоўцаў, сваякоў і блізкіх, што прадугледжвалася ў адпаведных пастановах і распараджэннях урада і Дзяржкамчарнобыля.

Складана і супярэчліва ідзе працэс адаптацыі навасёлаў на новых месцах жыхарства, пры гэтым асабліва цяжка даводзіцца хворым і састарэлым людзям. Праз восем гадоў пасля чарнобыльскай аварыі нацыянальная праграма па ліквідацыі яе вынікаў змяняе свой накірунак. Калі раней упор рабіўся на адсяленне людзей, то зараз — на вырашэнне медыцынскіх праблем, аздараўленне насельніцтва, якое засталося жыць на забруджанай тэрыторыі. Адсяленне будзе выбарачным, там, дзе канкрэтным людзям немагчыма жыць па медыцынскіх паказаннях.

У сувязі з адсяленнем і самастойным выездам значнай колькасці насельніцтва ў раёне ўскладнілася дэмаграфічная сітуацыя, у першую чаргу на вёсцы. За перыяд з 1986 г. па 1994 г. працэнт непрацаздольнага насельніцтва павялічыўся з 30% да 38%, працаздольных стала менш. Гэта тэндэнцыя працягваецца. Пачынаючы з 1990 г. у цэлым па раёне пароджаных значна менш, чым памерлых. Пераважны выезд кваліфікаваных спецыялістаў і рабочых прывёў да кадравай праблемы і як вынік — да ўзнікнення цяжкасцей у вырашэнні вытворчых і сацыяльных пытанняў.

Немалаважнае значэнне ў распрацоўцы канцэпцыі пражывання насельніцтва на забруджанай тэрыторыі, карэкціроўцы мерапрыемстваў па ліквідацыі наступстваў аварыі мела ўдакладненне радыяцыйнай абстаноўкі і прынятие больш правільных рашэнняў. З 1992—1993 гг. гэта работа пачала праводзіцца пастаянна. Былі пераабследаваны ўсе сельгасугоддзі і лясы. Матэрыялы абследаванняў, у тым ліку і картаграфічныя, маюцца ў калгасах і лясніцтвах для кіраўніцтва ў рабоце. Пры гэтым устаноўлена, што на 23,7% плошчы лясоў дазволены збор дароў лесу і нарыхтоўка дроў пры абавязковым дазіметрычным кантролі; на плошчы 23,4% забаронены работы ў лясах, доступ людзей на гэту тэрыторыю абмежаваны; на тэрыторыі 52,9% лясоў нарыхтоўка дроў і збор дароў лесу забаронены. У сувязі з гэтым узнікла праблема забеспячэння насельніцтва чыстым палівам.

У 1993 г. выкананы работы па пераабследаванні 14 адселеных вёсак з мэтай вызначэння іх далейшай перспектывы, а таксама 17 вуліц Слаўгарада. Пры гэтым дэталёва вывучана тэрыторыя 22 школ і дзіцячых садоў, бальніцы, некаторых фельчарска-акушэрскіх пунктаў, клубаў, бібліятэк. У 1994 г. гэтыя мерапрыемствы праведзены ў некаторых населеных пунктах Каменкаўскага сельсавета з узроўнем забруджанасці 5—15 Кі/км². Абследаваны яшчэ 10 вуліц Слаўгарада. Пераабследаваны землі дзяржаўнага запасу на плошчы 57 868 га, якія выдзелены калгасам і прадпрыемствам горада ў зоне адсялення. Завершаны адбор проб малака і бульбы па кожным населеным пункце. Яны накіраваны ў Навукова-даследчы інстытут радыяцыйнай медыцыны для вызначэння гадавых эквівалентных доз апрамянення насельніцтва.

Пачынаючы з 1986 г. у раёне ажыццяўляецца комплекс дэзактывацыйных работ. Да 1990 г. яны выконваліся сіламі і сродкамі вайсковых падраздзяленняў. Былі прадэзактываваны тэрыторыі васьмі школ і 26 населеных пунктаў, з іх 18 двойчы. На гэтыя мэты было выдаткавана 111,2 млн. рублёў у цэнах 1991 г. З 1993 г. работы па дэзактывацыі вядуцца на якасна новым узроўні і выконваюцца створаным па рашэнні райвыканкома прадпрыемствам «Радон». Ім праведзена дэзактывацыя тэрыторый дзіцячых садоў № 1 і 3, СШ № 2 у Слаўгарадзе, іншых аб'ектаў. Аднак вынікі работ па дэзактывацыі населеных пунктаў нязначныя.

Ад Чарнобыльскай катастрофы асабліва пацярпела сельская гаспадарка раёна. На пачатак 1994 г. усе 45 689 га сельскагаспадарчых угоддзяў забруджаны, з іх 78,5% маюць забруджанасць звыш 5 Кі/км². У гэтых умовах самай складанай праблемай з'яўляецца вырошчванне прадукцыі, якая па колькасці радыенуклідаў не шкодзіць здароўю чалавека. Забяспечваюцца таксама меры радыяцыйнай аховы людзей, якія працуюць на забруджаных тэрыторыях, у першую чаргу механізатараў.

Нягледзячы на недастатковае фінансаванне сельскай гаспадаркі па чарнобыльскай праграме, асабліва пасля 1991 г., у раёне праведзены комплекс неабходных ахоўных мерапрыемстваў, у тым ліку

перaспецыялізацыя сельгасвытворчасці, залужэнне, унясенне ў глебу павышаных доз мінеральных угнаенняў, выключэнне з абароту моцна забруджаных зямель. Усё гэта разам з працоўнай актыўнасцю вяскоўцаў дазволіла спачатку значна скараціць, а ў апошнія гады звесці да мінімуму вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі з перавышэннем устаноўленых нормаў радыяцыйнай бяспекі. У 1993—1994 гг. практычна ўся прадукцыя раслінаводства адпавядала гэтым нормам. Калі ў 1992 г. у выніку радыяцыйнага кантролю вытворцам вернута 227 т забруджанага малака, у 1993 г. — 2 т, то ў 1994 г. — ніводнай. Зямля, на якой з прычыны высокай забруджанасці радыенуклідамі немагчыма вытворчасць чыстай прадукцыі, выключана з сельскагаспадарчага карыстання — усяго 7744 га, 4946 га перададзена ў распараджэнне лясной гаспадаркі пад пасадку лесу, 10 872 га пераведзены ў катэгорыю зямель дзяржаўнага запасу. Уся прадукцыя радыялагічнай службай аграпрома ўзята пад суцэльны радыяцыйны кантроль.

Але пакуль што не ўдалося стабілізаваць паказчыкі чыстага мяса ў грамадскім сектары. У 1992 г. мясакамбінаты па прычыне высокай забруджанасці вярнулі гаспадаркам 290 галоў жывёлы, у 1993 г. — 50, у 1994 г. — 61 галаву. Галоўная прычына — выкарыстанне забруджанай пашы. Нездавальняючай застаецца якасць малака ў прыватным сектары. Звыш дапушчальнага ўзроўню забруджана паша і як вынік — малако ў вёсках Сычын, Целяшы, Любаны, Усход, Рудня, Папоўка, Свенск, Лебядзёўка, Новая Слабада, Завад-Віравая, Старая Каменка, Дубна, Рэкта, Міхайлаўка.

Пражыванне насельніцтва ва ўмовах радыеактыўнага забруджвання павышае патрабаванні да сфер будаўніцтва, добраўпарадкавання населеных пунктаў раёна, развіцця сферы камунальнага і культурнага абслугоўвання насельніцтва. За пасляаварыйны перыяд у гэтых адносінах зроблена нямала. На сродкі па ліквідацыі вынікаў аварыі ў раёне заасфальтавана 140 км дарог агульнага карыстання і ўнутрыгаспадарчага прызначэння, 40 км грунтавога пакрыцця заменена гравійным. На вёсцы праведзена добраўпарадкаванне вуліц населеных пунктаў працягласцю каля 40 км, пракладзена 168,5 км водаправода, прасвідравана 78 артэзіянскіх шчылін, пабудавана 5 дзіцячых садоў, 5 школ, клуб, сталовая, 6 магазінаў, палігон для захавання радыяцыйных адходаў, 558 кватэр і жылых дамоў агульнай плошчай 38 457 м$^2$ і шэраг іншых аб'ектаў. У Слаўгарадзе добраўпарадкавана цэнтральная частка горада, пракладзена 4,5 км цеплавых сетак, пабудаваны палігон цвёрдых бытавых адходаў, пракладзена 0,5 км водаправода. Добраўпарадкавана 16,7 км, заасфальтавана 22,6 км вуліц горада. Пераведзены на газ дзве кацельні па вул. К.Маркса і Дзяржынскага. Распачаты работы па пераводзе кацельні ПТВ на газ. Зроблена вонкавае асвятленне горада ў аб'ёме 8,2 км. Вядзецца будаўніцтва лазнева-аздараўленчага комплексу. Узведзены ў эксплуатацыю два 70-кватэрныя жылыя дамы, будуецца 100-кватэрны жылы дом, шэраг іншых аб'ектаў. У той жа час у горадзе па-ранейшаму нездавальняюча вырашаюцца пытанні газіфікацыі, дарожнага будаўніцтва, камунальнага абслугоўвання.

Памяншэнню наступстваў аварыі на ЧАЭС прызвана садзейнічаць медыцынскае абслугоўванне і аздараўленне насельніцтва. У гэтым накірунку ў раёне праведзена пэўная работа, у першую чаргу медыцынскімі ўстановамі. Аднак яе вынікі не даюць падстаў для задавальнення, асабліва сярод дзяцей. За пасляаварыйны перыяд адзначаюцца ўстойлівыя прыросты — звыш 5 % — дзіцячых захворванняў анеміяй, хранічнымі атытамі і бранхітамі. Больш чым у 50% абследаваных дзяцей (у апошнія гады іх абследаванне праводзіцца штогод) выяўлены хранічныя захворванні; 100 дзяцей прайшлі паглыбленае медыцынскае абследаванне ў Навукова-даследчым інстытуце радыяцыйнай медыцыны, у 35 з іх выяўлены вузлавыя формы захворвання шчытападобнай залозы, у 2 выпадках дыягнаставаны рак. Назіраецца тэндэнцыя росту захворванняў у сталага насельніцтва пнеўманіямі, гастрытамі, сардэчна-сасудзістымі хваробамі. У параўнанні з дааварыйным перыядам захворванні павялічыліся на 20%, сухотамі — на 15%.

Некаторыя зрухі маюць месца ў развіцці сістэмы аховы здароўя ў раёне. За апошнія 5 гадоў праведзены капітальны рамонт галоўнага корпуса палiклінікі, інфекцыйнага аддзялення, пабудаваны памяшканні раённага ЦГіЭ, Целяшоўскай СВА, Лапаціцкага, Бярозаўскага, Гіжэнскага і Каменскага фельчарска-акушэрскіх



Дом для састарэлых у в. Ляс-ная.

пунктаў, вядзецца будаўніцтва Васька-віцкага, Шаламоўскага і Зімніцкага. Праведзены капітальны рамонт Ляснянскай СВА, выдзелены памяшканні для Ржаўскага і Прудоцкага фельчарска-акушэрскіх пунктаў. У цэнтральнай раённай бальніцы абсталяваны кабінет ультрагукавой дыягностыкі, фібрагастраскапіі, абноўлены рэнтгенаўская і флюараграфічная апаратура. Аднак у апошнія гады ў раёне рэзка абвастрылася становішча з забяспячэннем насельніцтва медыкаментамі.

Медыцынскія ўстановы раёна праводзяць работу па спецдыспансерызацыі і абследаванні дзяцей па праграме ВОЗ. Да яе прыцягваюцца спецыялісты абласных медыцынскіх устаноў, што дазваляе больш кваліфікавана праводзіць медагляд, аказваць дапамогу хворым. У 1993 г. медыцынскі агляд і неабходнае абследаванне прайшлі 64,2% сталага насельніцтва. Больш эфектыўнай рабоце медыцынскіх устаноў не спрыяе нявырашаная кадравая праблема: па штаце ім патрабуецца 78 урачоў, а працуе ўсяго 35.

За апошнія гады ў раёне праведзена работа па аздараўленні школьнікаў. У 1993 г. з 2580 дзяцей школьнага ўзросту аздароўлена 3120, або 120%. З гэтай мэтай шмат дзяцей накіроўвалася ў Германію, Польшчу і іншыя краіны, у санаторыі Беларусі.

Толькі за студзень—верасень 1994 г. 997 школьнікаў адпачывалі і лячыліся за мяжой. Аднак у апошні час ускладнілася вырашэнне праблемы аздараўлення пенсіянераў, дашкольнікаў, дзяцей з бацькамі. Многім з іх не па кішэні набыццё пуцёвак і аплата праезду, кошт якіх няспынна расце.

У адпаведнасці з пастановамі ўрада СССР, а потым з законам «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС» (1991), жыхары раёна карыстаюцца пэўнымі правамі, льготамі і кампенсацыямі. Гэта фіксаваная даплата да заработнай платы, пенсій і дапамог, грашовая дапамога за пражыванне на забруджанай тэрыторыі на кожнага члена сям'і, выдаткі па выплаце аднначасовай матэрыяльнай дапамогі, бясплатнае харчаванне школьнікаў і інш.

Такім чынам, аварыя на ЧАЭС рэзка пагоршыла ўмовы жыцця і дзейнасці насельніцтва Слаўгарадчыны. Шмат населеных пунктаў раёна трапілі ў зону высокага радыяцыйнага забруджвання, многія вёскі пакінуты жыхарамі, зараслі травой і быльнягом. Частка зямель і лугоў наогул выключана з гаспадарчага карыстання. Вынікі Чарнобыльскай катастрофы цяжка адбіліся на стане здароўя людзей.

*І.Я.Марчанка.*

## Сэрца яго неспакой

«Сэрца шчыміць ад кожнага наведвання мясцін, з якімі звязана, лічы што, усё жыццё» — гэтымі словамі не раз пачынаў гаворку пры сустрэчы Іван Восіпавіч Ерашэнка, цяпер ужо мінчанін, а яшчэ колькі гадоў таму жыхар вёскі Кулікоўка, старшыня тагачаснага калгаса імя Куйбышава.

Вёскі гэтага калгаса, як адна, пацярпелі

ад катастрофы ў Чарнобылі. Іх сёння нават на карце раёна ўжо не існуе. Пахаваны яны, і «смерць» тую прынёс ім не бот ворага, а мірны атам, утаймаваць які не дала безгаспадарчасць людская. Але не пахаваць успаміны пра былое, якое насіла характар звычайнага набытковага жыцця, веры ў лепшае будучае і, вядомая справа, радасці кожнаму наступнаму дню. Сёння там жыцця няма. Там, дзе калісь кожны куточак быў родны сэрцу, дзе ў 1959 годзе пачынаў старшынёўства, сёння не чуваць рокату трактароў, гоману дзяцей, мілагучнай песні пад час наладжваемых мерапрыемстваў па заканчэнні сельскагаспадарчых кампаній.

25 гадоў прарабіў ён на гэтай пасадзе, імкнуўся мацаваць гаспадарку, а значыць, і дабрабыт сваіх калгаснікаў. Былі поспехі, былі расчараванні, але ж было і тое, што заўсёды надавала сіл, — родны кут. Прайшло ўжо колькі часу, але ўсё роўна не знаходзіць ветэран вайны і працы адказу на пытанне, што з-за чыёйсьці халатнасці пакутуюць людзі.

— Калі не пабуду на сваёй малой радзіме які час, сэрца пачынае сумаваць, здаецца, на крылах паляцеў бы туды. Што ні кажыце, а сталае дрэва вельмі цяжка прыжываецца на новым месцы. Так і ў мяне. Здаецца, і ў дзяцей, дзякуй Богу, усё ладзіцца, пяцёра ўнукаў цешаць душу, але хочацца сустрэцца са сваімі знаёмымі, якіх у мяне засталося нямала ў Слаўгарадзе, увогуле падыхаць родным паветрам, якое сілкуе. Нягледзячы на тое, што зямля гэтая хворая на цяжкую хваробу, — з сумам працягвае Іван Восіпавіч.

Юнаком пайшоў ён на барацьбу з ворагам у гады ваеннага ліхалецця. І пра той час цёпла ўспамінаў народны паэт Калмыкіі Міхаіл Ханінаў, з якім ён разам партызаніў. Ваяваў ён і ў дзеючай арміі, вызваляючы ад ненавіснага ворага сваю Радзіму.



І.В.Ерашэнка.

Потым была праца па аднаўленні разбуранай гаспадаркі. Пачынаў брыгадзірам, быў намеснікам старшыні, загадчыкам фермы, старшынёй калгаса. Пад час яго кіравання калгасам імя Куйбышава значна папрыгажэлі ўсе чатыры вёскі гаспадаркі, пры ім калгаснікі стварылі добрае месца адпачынку — возера, была свая пасека і многае іншае. Менавіта з яго лёгкай рукі, як кажуць, сталі на крыло многія спецыялісты, якія потым таксама ўзначалілі калектывы ў раёне і вобласці і імёны якіх і сёння на слыху. Не цураўся дзяліцца здабыткамі свайго калектыву праз раённую газету. І цяпер, у свае 70 гадоў, Іван Восіпавіч часты госць на Слаўгарадчыне, цікавіцца справамі сваіх землякоў. Ён бадзёры і вясёлы, як і належыць быць чалавеку, які зрабіў нямала для іншых.

*В. Уладзімірава.*

*Ленінскае слова. 1996. 30 крас.*

## Роднае

Недзе ў самым патаемным куточку душы, нават для мяне самога дакладна наўрад ці акрэсленым, даўно-даўно, яшчэ з тых часоў, калі мне здалося, што я пазнаў горад, жыве мая гордасць за тое, што я — вясковец. Сваім сябрам-гараджанам я неаднойчы — па нагодзе, вядома, — гаварыў: «У мяне ёсць не толькі «геаграфічны пункт», дзе я нарадзіўся. У мяне ёсць пэўнае месца ў гэтым пункце — з дваром ці дворышчам, з лапічкам зямлі, са шпакоўняй, градой і яблыняй, — дзе я вырас. З